« »

20 верасня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта ВДУ адкрылася фотавыстава “Зачараваны прыгажосцю” дацэнта кафедры фундаментальнай і прыкладной біялогіі Леанарда Мяржвінскага. Мерапрыемства арганізавана сумесна з Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва. У экспазіцыі (куратар М. Цыбульскі) было прадстаўлена некалькі дзясяткаў здымкаў, у якіх адлюстроўваецца ўся прыгажосць беларускай прыроды. Большасць фотаработ Леанарда Міхайлавіча, чалавека творчага, адкрытага і шчыра ўлюбёнага ў сваю справу, у першую чаргу зачароўвае атмасферай зафіксаванай прыроднай з’явы. Яго глыбокія веды марфалогіі раслін і ўменне выбраць правільны ракурс дазваляюць раскрыць як асаблівасці структуры, так і эстэтыку адлюстраванага аб’екта. Аднак каштоўнасць гэтай выстаўкі не толькі ў эстэтыцы прадстаўленых работ, але і ў тым, што экспазіцыя нагадвае, якое прыроднае багацце маем мы, беларусы, і як важна яго берагчы і захоўваць.

« »

11 кастрычніка ў мастацкай галерэі В.А. Грамыкі ў г. Оршы адбылося адкрыццё выстаўкі “Краявіды Аршаншчыны” па выніках мастацкага пленэру, які праходзіў у жніўні 2024 года, у гонар 30-годдзя “Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны”. Арганізатарам пленэру і выставы выступіла кафедра выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава (куратары Д. Кузьміч і М. Цыбульскі). Да ўдзелу ў пленэры і выставе далучыліся вядомыя і маладыя мастакі з Мінска, Віцебска, Маладзечна, Ліды і Клімавічаў. У экспазіцыі прадстаўлены 63 эцюды, напісаныя на працягу 10 дзён, дзе адлюстраваны летнія матывы Аршаншчыны.

« »

17 кастрычніка ў Гарадоцкім краязнаўчым музеі ў межах прэзентацыі выстаўкі “Грані творчасці” былога дацэнта кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Івана Хіцько прайшла творчая сустрэча, прысвечаная юбілею гэтага знакамітага ўраджэнца Гарадоччыны. У час урачыстай часткі адбылося ўзнагароджанне І. Хіцько юбілейным медалём “80 год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”, Ганаровай граматай упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама і Падзякай ад кіраўніцтва ВДУ імя П.М. Машэрава. Удзельнікі сустрэчы змаглі паслухаць успаміны юбіляра аб сваім жыцці і творчасці, пазнаёміцца з творамі мастака, дызайнера і педагога.

Выпускнік мастацка-графічнага факультэта ВДПІ імя С.М. Кірава Іван Хіцько з 1966 па 2014 год працаваў на кафедры мастацкага канструявання і методыкі працоўнага навучання, прайшоў шлях ад асістэнта да дацэнта (1991). Ён актыўна займаўся даследаваннем мастацкай апрацоўкі драўніны на тэрыторыі Беларусі, вывучаў творчасць народных разьбяроў і архітэктурны дэкор народнага жылля. На працягу ўсіх гадоў працы на факультэце ўдзельнічаў у экспедыцыйных паездках і перасоўных выставах.

За час працы ў нашай установе вышэйшай адукацыі ім апублікавана каля сямідзесяці навуковых і вучэбна-метадычных артыкулаў і дапаможнікаў. З 1966 года пад яго кіраўніцтвам было выканана каля 300 дыпломных работ. Важным накірункам творчай дзейнасці сталі шматлікія дызайнерскія распрацоўкі, праекты мастацка-канструктарскага рашэння інтэр’ераў і экстэр’ераў дамоў культуры, музеяў, клубаў, бібліятэк, добраўпарадкавання і арганізацыі гульнявых зон з выкарыстаннем малых архітэктурных форм і г.д. З 1999 года Іван Хіцько з’яўляўся членам міжнароднага журы

конкурсу майстроў народных рамёстваў і промыслаў, які праводзіцца ў час фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

« »

30 кастрычніка ў межах святкавання 65-гадовага юбілею мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава адбылося адкрыццё выставы “Росчыркі часу” (куратар А. Кастагрыз) з фонду майстэрні станковай графікі, якая паўстагоддзя функцыянуе на факультэце. У гэты ж дзень адбыўся вернісаж рэтраспектыўнай выставы з фондаў МГФ у Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва (куратары С. Сотнікаў, А. Кастагрыз). У экспазіцыі пад назвай “Вехі мастацка-графічнага” былі прадстаўлены жывапісныя творы розных гадоў з фондаў мастацка-графічнага факультэта.

« »

1 лістапада ў ВДУ імя П.М. Машэрава пачала працу міжнародная канферэнцыя “Мастацтва і педагогіка ў сучасным свеце”, удзел у якой прынялі прадстаўнікі трох дзяржаў (Беларусь, Расія, Кітай). На пленарным пасяджэнні і ў фармаце трох секцый (“Гісторыя Віцебскай мастацкай школы, традыцыі і сучаснасць. Тэорыя і гісторыя мастацтваў”, “Актуальныя праблемы візуальных мастацтваў і дызайну”, “Інавацыйныя тэхналогіі ў мастацка-педагагічнай адукацыі”) з даследчымі работамі выступілі прадстаўнікі ВДУ – выкладчыкі мастацка-графічнага факультэта, а таксама госці нашага ўніверсітэта.

У гэты ж дзень адкрылася выстава выкладчыкаў МГФ да юбілею факультэта. У экспазіцыі жывапісныя і графічныя творы выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва, а таксама творы дэкаратыўнага мастацтва прадстаўнікоў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі. На выставе былі прадстаўлены навуковыя і метадычныя выданні, аўтарамі якіх з’яўляюцца даследчыкі мастацка-графічнага факультэта.

« »

5 лістапада ў дзіцячай мастацкай школе № 3 “Маладзік” адкрылася персанальная выстаўка прафесара кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Р. Фядзькова, на якой прадстаўлены пленэрныя работы, напісаныя пераважна ў 2024 годзе.

« »

14 лістапада ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылося адкрыццё выставы вядомага беларускага жывапісца, выпускніка мастацка-графічнага факультэта 1983 года Леаніда Мядзведскага (куратар М. Цыбульскі). У экспазіцыі пад назвай “Метамарфозы колеру і вобразаў” прадстаўлена больш за 40 партрэтаў, пейзажаў і нацюрмортаў, якія выкананы ў тэхніцы гуашы. Леанід Мядзведскі на працягу многіх гадоў выкладаў у дзіцячай мастацкай школе № 1 г. Віцебска (1983–2017). Удзельнік мастацкіх выставак з 1982 года. Сябра Беларускага саюза мастакоў (1997). Удзельнік вялікай колькасці пленэраў і творчых сімпозіумаў (Беларусь, Германія, Ізраіль, Латвія, Літва, Польшча, Фінляндыя). Творы мастака знаходзяцца ў зборах Музея сучаснага мастацтва (Мінск), Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, Музея Марка Шагала ў Віцебску, мастацкай галерэі Полацка, Музея г. Нінбурга (Германія), Музея Марка Роткі (Даўгаўпілс, Латвія), Цэнтра сучаснага мастацтва “Марс”(Масква, Расія), у прыватных калекцыях у Беларусі, Латвіі, Літве, Расіі, Францыі, Германіі, Фінляндыі, Ізраілі.